**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

___________________________________________________

(назва вышэйшай навучальнай установы)

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
_________________ А. В. Данільчанка
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
___________________2015 г.__
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД – /вуч.

**Сучасная беларуская мова**

**(назва дысцыпліны)**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

**1-21 05 04 Славянская філалогія**

(код спецыяльнасці) (назва спецыяльнасці)

2015 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой праграмы “Сучасная беларуская мова”: Вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях 1-21 05 01 “Беларуская філалогія” (па напрамках), 1-21 05 04 “Славянская філалогія”, / Аўт.-склад. З.І.Бадзевіч, С.А.Важнік, Г.К.Чахоўскі. – Мн., РІВШ, 2015. Зацверджана Вучэбна-метадычным аб’яднаннем ВНУ Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі 03 .03. 2015 г. Рэгістрацыйны № ТД-Д. 327/ тып

**СКЛАДАЛЬНІК:**

С.М. Балотнікава, ст. выкладчык
(імя, імя па бацьку, прозвішча, пасада, вучоная ступень, вучонае званне)

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай ___________ сучаснай беларускай мовы __________________
(назва кафедры)
(пратакол № 10 ад _19.05.2015 г.)

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 6 ад __29.06. 2015 г._)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс “Сучасная беларуская мова: Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія” мае **на мэце** даць фундаментальныя лінгвістычныя веды, неабходныя філолагу для здзяйснення сваёй прафесійнай дзейнасці, засваення тэарэтычных асноў фанетыкі, арфаграфіі, лексікалогіі і фразеалогіі і набыцця навыкаў фанетычнага, арфаграфічнага, лексічнага аналізу слова, разумення моўнай дынамікі і асноўных тэндэнцый развіцця мовы з улікам ідыяэтнічнага нацыянальнага кампанента, характару і форм яе сувязей з іншымі мовамі.

Прапанаваны курс утрымлівае базавыя веды па беларускай мове для спецыяліста-філалога, што забяспечвае фарміраванне прафесійных кампетэнцый пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па беларускай мове для агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў, спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў, работнікаў асветы, культуры, друку, навукова-даследчых устаноў Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, веданне курса “Сучасная беларуская мова: Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія” неабходна для засваення дысцыплін “Сучасная славянская мова”, “Методыка выкладання беларускай мовы”, “Сучасная беларуская мова: Марфеміка. Словаўтварэнне. Марфалогія”, для паспяховага праходжання педагагічнай і перакладчыцкай практык.

***Задачы*** дысцыпліны:

- авалоданне лінгвістычнай тэорыяй па фанетыцы, арфаэпіі, графіцы, арфаграфіі, лексікалогіі і фразеалогіі беларускай мовы;
- фарміраванне ўсвядомленага разумення студэнтамі месца беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры і духоўным станаўленні нацыі;
- выяўленне адметных спецыфічных заканамернасцей, якія праяўляюцца на ўзроўні фанетыкі, арфаграфіі, лексікалогіі і фразеалогіі;
- усведамленне сутнасці і дынамікі фанетычных, арфаграфічных і лексічных працэсаў беларускай мовы і асноўных тэндэнцый яе развіцця;
- павышэнне арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці;
- набыццё устойлівых навыкаў самастойнага аналізу лінгвістычных фактаў і з’яў;
- фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў зносін па-беларуску, навыкаў карыстання вусным і пісьмовым маўленнем у сферы працоўнай і прафесійнай дзейнасці, а таксама розных сітуацыях зносін;
- выхаванне ў студэнтаў павагі да беларускага народа як носьбіта беларускай мовы, адчуванне сябе неад’емнай яго часткай;
- выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця нацыянальнай самапавагі, імкнення да далейшага ўзбагачэння лексічных сродкаў беларускай мовы;
- садзейнічанне падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў з творчым і крытычным мысленнем, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Патрабаванні да ўзроўню засваення дысцыпліны

Студэнты павінны ***ведаць***:

– прадмет, задачы і асноўныя паняцці фанетыкі, арфаэпіі, графікі, арфаграфіі, лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі;
– суадносіны нормы і варыянтнасці на розных узроўнях беларускай літаратурнай мовы;
– асноўныя характарыстыкі моўных адзінак у дыяхранічным і сінхранічным аспектах;
– стратыфікацыю лексічнага фонду беларускай мовы;
– асноўныя тыпы міжслоўных і міжфраземных адносін.

***умець***:

– размяжоўваць суадносіны мовы і маўлення;
– карыстацца моўнымі адзінкамі розных узроўняў згодна з літаратурнай нормай;
– карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі;
– характарызаваць моўныя адзінкі з пункту погляду іх семантыкі, структуры і функцыі;
– вызначаць стылістычную афарбоўку слова і фразеалагізма, іх паходжанне, сферу ўжывання;
– карыстацца лінгвістычнымі слоўнікамі;
– аналізаваць лінгвістычны матэрыял;
– валодаць методыкай рэферыравання тэксту і яго перакладу на беларускую мову;
– праводзіць самастойныя навуковыя даследаванні з прыцягненнем комплексу беларускіх і замежных лексікаграфічных прац і тэарэтычных дапаможнікаў.

***валодаць:***

– правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;
– нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
– паняццямі і тэрмінамі фанетыкі, арфаэпіі, графікі, арфаграфіі, лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
– формамі і метадамі лінгвістычнага аналізу рознаўзроўневых моўных адзінак;
– сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп'ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па фанетыцы, арфаэпіі, графіцы, арфаграфіі, лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі.

Навучанне фанетыцы, арфаэпіі, графіцы, арфаграфіі, лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі (лекцыі, практычныя заняткі, самастойная падрыхтоўка студэнтаў) ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў навуковасці і даступнасці, пераемнасці і перспектыўнасці, сістэмнасці і паслядоўнасці,

сувязі тэорыі з практыкай, актыўнасці і самастойнасці і інш. На практычных занятках выкарыстоўваюцца разнастайныя метады і прыёмы навучання: індывідуальнае, франтальнае або выбарачнае апытанне, праца з інфармацыйна-даведачнымі матэрыяламі, пісьмовыя работы, сярод якіх дыктант і кантрольныя работы, выкананне тэставых заданняў (у тым ліку камп'ютарных), вусны і пісьмовы фанетычны і лексічны разборы, разнастайныя віды навучальных творчых работ, вусныя выступленні і інш., што стварае ўмовы для фарміравання лінгвістычнай і маўленчай кампетэнцый студэнтаў; спрыяе самастойнаму асэнсаванню імі моўных з'яў, паглыбленню ці падагульненню ведаў па вывучанай тэме, раздзеле, фарміраванню ўмення аналізаваць, сістэматызаваць, параўноўваць, дыферэнцаваць моўныя з'явы, класіфікаваць моўныя адзінкі на аснове выяўлення спецыфічных і агульных прымет, рабіць абгрунтаваныя вывады; развівае інтэлектуальныя здольнасці, садзейнічае самастойнаму назапашванню ведаў.

Такім чынам, змест і задачы вучэбнага курса "Сучасная беларуская мова: Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія" скіраваны на тое, каб дапамагчы студэнтам асэнсаваць мову як суладную сістэму, у якой усе ўзроўні ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены, садзейнічаць фарміраванню навыкаў самастойнага аналізу лексічных і марфалагічных фактаў і з'яў, прафесійных моўных і маўленчых уменняў і навыкаў, спрыяць станаўленню і развіццю асобы філолага і педагога.

Агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны, складае **52** гадз.

Колькасць аўдыторных гадзін складае **34** гадз.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:

**20** гадз. – лекцыйных;

**10** гадз. – практычных;

**4** гадз. – КСР.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне адсутнічае.

Для засваення курса неабходна выконваць розныя віды самастойнай работы:

– чытанне абавязковай і дадатковай літаратуры;
– карыстанне лінгвістычнымі лексікаграфічнымі крыніцамі;
– падрыхтоўка выступленняў на практычных занятках;
– падрыхтоўка электронных прэзентацый;
– хатнія пісьмовыя заданні;
– кіруемая самастойная работа студэнтаў.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца, выбіраюцца і адаптуюцца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі спецыялістаў.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца:

- вывучэнне і канспектаванне хрэстаматый, зборнікаў навуковых прац, манаграфій (асобных раздзелаў);
- работа са слоўнікавай і даведачна-энцыклапедычнай літаратурай;
- складанне тэрміналагічнага слоўніка (гласарыя) па вывучаемых раздзелах (вучэбнай тэме);
- складанне картатэкі ілюстрацыйных матэрыялаў па вучэбных тэмах (вучэбных раздзелах);
- падрыхтоўка вучэбных паведамленняў;
- выкананне кантрольных работ;
- пошукавая дзейнасць у даведачна-бібліяграфічных аддзелах бібліятэк;
- складанне бібліяграфіі па вывучаемых тэмах;
- анатаванне друкаваных і электронных крыніц (асобных глаў, раздзелаў кніг; артыкулаў, уключаючы публікацыі ў перыёдыцы);
- складанне разгорнутых планаў і тэзісаў навуковых крыніц (у тым ліку вядзенне запісаў цытатнага характару);
- рэферыраванне або канспектаванне навуковых артыкулаў, асобных раздзелаў іншых навуковых крыніц (напрыклад, манаграфій), фармуляванне іх рэзюмэ;
- напісанне аналітыка-ацэначных тэкстаў (каментарыяў, водзываў, рэцэнзій) паводле прачытаных навуковых і вучэбных крыніц;
- распрацоўка індывідуальных і калектыўных навукова-творчых заданняў і праектаў;
- падрыхтоўка і ўдзел у правядзенні актыўных форм навучання (дыскусіі, дэбаты, прэс-канферэнцыі);
- самакантроль шляхам выканання трэніровачных (у тым ліку камп'ютарных) тэстаў і заданняў;
- індывідуальныя кансультацыі з выкладчыкам.
- распрацоўка наглядных матэрыялаў па вывучаемых тэмах, уключаючы стварэнне мультымедыйных прэзентацый;
- напісанне тэматычных дакладаў, дыскусійных разважанняў на праблемныя тэмы;
- складанне тэставых заданняў па вучэбных тэмах (вучэбных раздзелаў);
- выкананне даследчыцкіх і творчых заданняў.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### УВОДЗІНЫ

Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі. Роля роднай мовы ў працэсе развіцця асобы. Мова як сродак камунікацыі і інструмент пазнання рэчаіснасці. Роля і месца беларускай мовы ў сучасным грамадстве. Сацыяльна-функцыянальная дыферэнцыяцыя беларускай нацыянальнай мовы.

Беларуская літаратурная мова, яе прыметы: наддыялектнасць, унармаванасць, кадыфікаванасць, поліфункцыянальнасць. Нормы беларускай літаратурнай мовы.

Беларуская мова сярод моў свету. Генетычная і тыпалагічная характарыстыка беларускай мовы. Канцэпцыі паходжання беларускай мовы. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратурнай мовы. Беларуская літаратурная мова і мова мастацкай літаратуры.

### ФАНЕТЫКА

Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы. Прадмет фанетыкі. Агульная і прыватная фанетыка, апісальная, параўнальная і гістарычная фанетыка. Метады вывучэння гукавога ладу мовы. Сувязь фанетыкі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

Паняцце аб фанетычным чляненні моўнай плыні. Зыходныя прынцыпы арганізацыі і чланення адзінак мовы і маўлення. Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны ў фанетыцы.

Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза, фонаабзац тэкст; націск, інтанацыя.

Гукі мовы. Аспекты вывучэння гукаў: артыкуляцыйны, акустычны, перцэптыўны, функцыянальны. Артыкуляцыйны аспект вывучэння гукаў. Будова маўленчага апарату; актыўныя і пасіўныя органы маўлення. Асноўныя фазы артыкуляцыі. Артыкуляторныя (фізіялагічныя) метады даследавання гукаў. Акустычны аспект вывучэння гукаў. Агульныя акустычныя ўласцівасці гукаў. Частата ваганняў галасавых звязак і вышыня гука. Сіла і гучнасць гука. Спектр гука і тэмбр. Фармантная структура гука. Асноўныя метады акустычнага аналізу гукаў. Перцэптыўны аспект вывучэння гукаў. Універсальныя і спецыфічныя перцэптыўныя характарыстыкі гукаў. Асноўныя метады вывучэння ўспрымання гукаў. Функцыянальны аспект вывучэння гукаў. Функцыі гукаў у мове. Гукавы сімвалізм. Гук і фанема.

Прынцыпы класіфікацыі гукаў. Зычныя і галосныя гукі. Паняцце аб артыкуляцыйнай і акустычнай класіфікацыях гукаў. Артыкуляцыйная класіфікацыя зычных: падзел зычных на групы паводле ўдзелу голасу і шуму, месца і спосабу ўтварэння, адсутнасці ці наяўнасці дадатковай артыкуляцыі (палаталізацыі). Санорныя і шумныя, звонкія і глухія. Губныя (губна-губныя і губна-зубныя) і язычныя: пярэднеязычныя (зубныя і пярэднепаднябенныя), сярэднеязычныя (сярэднепаднябенныя), заднеязычныя (заднепаднябенныя). Змычныя (выбухныя), шчылінныя (фрыкатыўныя), змычна-шчылінныя (афрыкаты), змычна-праходныя. Цвёрдыя (парныя і няпарныя) і мяккія (парныя і

няпарныя) зычныя. Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных гукаў. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Галосныя верхняга, сярэдняга і ніжняга пад'ёму. Галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада. Артыкуляцыйная база беларускай мовы. Акустычная класіфікацыя гукаў. Асноўныя класы гукаў паводле акустычных прымет.

Транскрыпцыя. Віды транскрыпцыі (фанетычная, інтанацыйная, фанематычная). Сістэма транскрыпцыйных знакаў.

Склад як фанетычная адзінка. Суадносіны паміж складам і марфемай. Тэорыі складападзелу (склада): экспіраторная, санорная, тэорыя мускульнага напружання. Тыпы складоў: аднакампанентныя і шматкампанентныя, адкрытыя і закрытыя, прыкрытыя і непрыкрытыя. Структура беларускага склада (слабае прымыканне, тэндэнцыя да адкрытага і прыкрытага склада). Рухомасць складовай структуры слова.

Прасадычныя фанетычныя адзінкі (націск, інтанацыя, паўзы), іх роля ў арганізацыі моўнай плыні. Акцэнтная структура слова. Фанетычная прырода націску. Сродкі суперсегментнай арганізацыі слова. Тыпы націску. Акустычныя характарыстыкі беларускага націску. Рознамясцовасць, рухомасць слоўнага націску. Асноўны і пабочны націск у складаных словах. Праклітыкі і энклітыкі. Функцыі слоўнага, тактавага, фразавага і лагічнага націску. Акустычныя характарыстыкі інтанацыі. Фразаўтваральны патэнцыял інтанацыі. Кампаненты інтанацыі. Асноўныя функцыі інтанацыі: камунікатыўная, вылучальная, арганізавальная, эмацыянальная. Дыферэнцыяльныя прыметы інтанацыйных адзінак. Асноўныя камунікатыўныя тыпы выказванняў: апавядальны, пытальны, клічны. Паняцце інтанацыйнай канструкцыі (ІК) і інтанацыйнай структуры. Асноўныя тыпы ІК у беларускай мове.

Фанетыка тэксту. Тэкст і фонаабзац. Змены гукаў у маўленчай плыні. Паняцце сінтагматыкі і парадыгматыкі на фанетычным узроўні. Дыяхранічныя і сінхранічныя фанетычныя законы. Асноўныя фанетычныя працэсы: асіміляцыя, дысіміляцыя, метатэза, сцяжэнне, падаўжэнне, пратэза, эпентэза, дыярэза, акамадацыя, рэдукцыя, гаплалогія.

Пазіцыйныя чаргаванні гукаў як вынік фанетычных працэсаў. Пазіцыйныя чаргаванні зычных гукаў: звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, зубных (свісцячых) і пярэднепаднябенных (шыпячых), выбухных і афрыкат. Чаргаванні галосных у націскных і ненаціскных складах. Гістарычныя чаргаванні галосных і зычных гукаў.

## ФАНАЛОГІЯ

Фаналогія як раздзел мовазнаўства. Фанетычная і фаналагічная сістэмы сучаснай беларускай мовы. Дыстрыбуцыя фанем. Дыферэнцыяльныя і інтэгральныя прыметы фанем. Сігніфікатыўна і перцэптыўна моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Асноўны алафон, варыянт і варыяцыя фанемы. Гіперфанема і архіфанема. Нейтралізацыя фанемных супрацьпастаўленняў.

Фаналагічная сістэма беларускай мовы. Паняцце аб фаналагічнай падсістэме запазычаных і рэдкаўжывальных слоў. Сістэма зычных фанем у беларускай мове. Роля карэляцый у кансанантызме. Карэляцыі фанем па глухасці-звонкасці.

Няпарныя фанемы па глухасці-звонкасці. Карэляцыя цвёрдых-мяккіх зычных. Няпарныя цвёрдыя (зацвярдзелыя) зычныя. Карэляцыя шыпячых-свісцячых. Карэляцыя выбухных-афрыкат. Фаналагічны статус фанемы <j>. Фаналагічны статус падоўжаных (гемінатыўных) зычных. Сістэма галосных фанем у беларускай мове. Гукавыя рэалізацыі галосных фанем у моцных і слабых пазіцыях.

Моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Фанемныя рады. Сінтагматычныя адносіны ў фанетыцы і фаналогіі. Спалучэнні зычных з наступнымі галоснымі фанемамі. Спалучэнні зычных з наступнымі зычнымі фанемамі. Абмежаванні ў парадыгматыцы і сінтагматыцы галосных і зычных фанем.

## АРФАЭПІЯ

Прадмет і задачы арфаэпіі. Асноўныя нормы сучаснага беларускага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Прычыны, характар і літаратурныя межы арфаэпічнай варыянтнасці ў беларускай мове. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны. Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

## ГРАФІКА

Прадмет і задачы графікі. Графічная сістэма сучаснай беларускай мовы. Літарныя графічныя сродкі. Алфавіт як аснова графікі. Нялітарныя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), націск, пунктуацыйныя знакі і інш. Гісторыя станаўлення беларускай графікі. Суадносіны паміж літарамі (графемамі) і гукамі (фанемамі) у беларускай графіцы. Складовы і гукавы прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары.

## АРФАГРАФІЯ

Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Арфаграма і апорнае напісанне. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны, фанематычны (марфалагічны), традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні. Фанетычныя, фанематычныя і традыцыйныя напісанні. Дыферэнцыйныя напісанні. Прынцыпы і правілы напісання слоў злітна, асобна, праз злучок. Ужыванне вялікай літары. Напісанне абрэвіятур і ўмоўных скарачэнняў. Правілы пераносу. Гісторыя станаўлення беларускай арфаграфіі. Тэндэнцыя развіцця арфаграфічнай нормы на сучасным этапе. Даведнікі па беларускай арфаграфіі.

## ЛЕКСІКАЛОГІЯ

Лексікалогія як раздзел моваэнаўства. Прадмет і задачы лексікалогіі, метады даследавання лексікі. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Аспекты вывучэння слова: семасіялагічны, этымалагічны, дыялекталагічны, анамасіялагічны, стылістычны.

Слова як адзінка мовы. Значэнне слова і паняцце. Функцыі слова. Спецыфіка

лексічных адзінак: узнаўляльнасць, непранікальнасць, цэльнааформленасць. Слова як знак. Форма і змест слова. Гісторыя фарміравання лексічнага складу беларускай мовы.

Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Тыпы лексічных значэнняў (прамыя – пераносныя, канкрэтныя – абстрактныя, агульныя – тэрміналагічныя, эмацыянальныя – неэмацыянальныя, матываваныя – нематываваныя, невытворныя – вытворныя, свабодныя – звязаныя).

Мнагазначнасць (полісемія). Прамыя (асноўныя) і пераносныя (вытворныя) значэнні. Мнагазначнасць слова і кантэкст. Тыпы пераносу значэнняў (метафара, метанімія, сінекдаха). Аманімія, яе віды і крыніцы. Крытэрыі размежавання аманіміі і мнагазначнасці. Паранімія. Стылістычная роля паронімаў.

Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы: лексіка-семантычная парадыгма, лексіка-семантычныя і тэматычныя групы. Функцыянальна-семантычныя палі, адносіны паміж іх членамі: сінанімія, гіпанімія, антанімія і канверсія.

Лексічныя сінонімы. Віды сінонімаў (абсалютныя, семантычныя, стылістычныя, семантыка-стылістычныя, кантэкстуальныя). Сінанімічны рад. Дамінанта сінанімічнага рада. Крыніцы сінаніміі. Лексічныя антонімы. Структурныя і семантычныя тыпы антонімаў. Лексічныя канверсівы, іх структурныя і семантычныя тыпы. Адрозненне канверсіваў ад сінонімаў і антонімаў.

Храналагічная і сацыялінгвістычная характарыстыка беларускай лексікі. Моўнае ядро і моўная перыферыя. Дынаміка лексіка-семантычнай сістэмы беларускай мовы. Актыўныя семантычныя працэсы ў лексіцы беларускай мовы канца XX ст. – пач. XXI ст. Актыўная і пасіўная лексіка. Устарэлыя словы: архаізмы і гістарызмы. Неалагізмы, іх тыпы.

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская, запазычаная лексіка). Класіфікацыя запазычанняў паводле паходжання і тэматычных груп. Лексічнае калькаванне. Асваенне запазычанняў. Экзатызмы і варварызмы. Інтэрнацыянальная лексіка.

Сацыяльная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Лексіка агульнаўжывальная, спецыяльная (прафесіяналізмы, тэрміны), яе уласцівасці.

Тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі, яе характарыстыка. Сацыяльная дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Жаргонная і прастамоўная лексіка. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы: міжстылёвая (нейтральная) і стылістычна афарбаваная.

## ЛЕКСІКАГРАФІЯ

Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы лексікаграфіі. Тыпалогія слоўнікаў. Слоўнікавы артыкул, яго структурныя часткі.

Тлумачальныя, дыялектныя, перакладныя, гістарычныя, этымалагічныя, фразеалагічныя, слоўнікі новых слоў і значэнняў, іншамоўных слоў, сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў, асацыятыўныя, арфаграфічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфемныя, граматычныя, тэрміналагічныя, частотныя, адваротныя, слоўнікі мовы пісьменнікаў, слоўнікі эпітэтаў і перыфраз. Слоўнікі ўласных імёнаў. Энцыклапедычныя даведнікі (агульныя і прадметныя).

# ФРАЗЕАЛОГІЯ

Фразеалогія як лінгвістычная дысцыпліна. Прадмет і задачы фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных адзінак. Паняцце фразеалагічнага звароту. Устойлівасць і варыянтнасць фразеалагізмаў. Суадносіны фразеалагізмаў з часцінамі мовы (субстантыўныя, дзеяслоўныя, ад’ектыўныя, прыслоўныя, выклічнікавыя фразеалагізмы). Структурныя тыпы фразеалагізмаў. Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле семантычнай злітнасці (фразеалагічныя зрашчэнні, адзінствы, спалучэнні, выразы).

Крыніцы беларускай фразеалогіі. Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле паходжання (спрадвечна беларускія, запазычаныя, калькі). Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў (міжстылёвыя, кніжныя, размоўныя, функцыянальна незамацаваныя).

Сінанімія, антанімія, аманімія і мнагазначнасць фразеалагізмаў у беларускай мове. Лексічныя замены. Эўфемізмы і дысфемізмы. Перыфразы. Прыказкі. Прымаўкі. Крылатыя словы. Афарызмы.

Даведнікі па беларускай фразеалогіі і парэміялогіі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Іншае | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** |
| **1** | **Уводзіны** | **4** | | | | | | |
| 1.1. | 1. Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі. Роля і месца беларускай мовы ў сучасным грамадстве. Роля роднай мовы ў працэсе станаўлення асобы і ў развіцці цывілізацыі.<br>2. Сацыяльна-функцыянальная дыферэнцыяцыя беларускай нацыянальнай мовы: літаратурная мова, тэрытарыяльныя дыялекты, сацыялекты, мова горада і інш.<br>3. Беларуская мова сярод іншых моў свету. Генетычная і тыпалагічная характарыстыка беларускай мовы. Канцэпцыі паходжання беларускай мовы.<br>4. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратурнай мовы. | 2<br><br>2 | | | | Электронны падручнік, курс лекцый | | Вусныя паведамленні |
| **2** | **Фанетыка. Фаналогія** | **6** | **4** | | | | **2** | |
| 2.1. | 1. Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы. Прадмет фанетыкі. Сувязь фанетыкі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.<br>2. Паняцце аб фанетычным чляненні моўнай плыні. | 2 | | | | Электронны падручнік, курс лекцый | | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны ў фанетыцы.<br>3. Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза, фонаабзац тэкст; націск, інтанацыя.<br>4. Гукі мовы. Аспекты вывучэння гукаў: артыкуляцыйны, акустычны, перцэптыўны, функцыянальны.<br>5. Прынцыпы класіфікацыі гукаў. Зычныя і галосныя гукі. Артыкуляцыйная і акустычная класіфікацыі гукаў. Артыкуляцыйная база беларускай мовы.<br>6. Транскрыпцыя. Віды транскрыпцыі (фанетычная, інтанацыйная, фанематычная). Сістэма транскрыпцыйных знакаў. | | 2 | | | | | |
| 2.2. | Склад. Націск. Інтанацыя.<br>1. Склад як фанетычная адзінка. Тэорыі складападзелу (склада). Тыпы складоў. Структура беларускага склада.<br>2. Прасадычныя фанетычныя адзінкі (націск, інтанацыя, паўзы), іх роля ў арганізацыі моўнай плыні.<br>3. Акцэнтная структура слова. Фанетычная прырода націску. Сродкі суперсегментнай арганізацыі слова. Тыпы націску. Праклітыкі і энклітыкі. Функцыі слоўнага, тактавага, фразавага і лагічнага націску.<br>4. Інтанацыя. Паняцце інтанацыйнай канструкцыі (ІК) і інтанацыйнай структуры. Асноўныя тыпы ІК у беларускай мове. | | 2 | | | | 2 | Пісьмовы тэст |
| 2.3. | Змены гукаў у маўленчай плыні.<br>1. Асноўныя фанетычныя працэсы: асіміляцыя, дысіміляцыя, метатэза, сцяжэнне, падаўжэнне, пратэза, эпентэза, дыярэза, акамадацыя, рэдукцыя, гаплалогія.<br>2. Пазіцыйныя чаргаванні галосных і зычных гукаў.<br>3. Гістарычныя чаргаванні галосных і зычных гукаў. | 2 | | | | Электронны падручнік, курс лекцый | | Вуснае апытванне |
| 2.4. | 1. Фаналогія як раздзел мовазнаўства. Дыферэнцыяльныя і інтэгральныя прыметы фанем. | 2 | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сігніфікатыўна і перцэптыўна моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Асноўны алафон, варыянт і варыяцыя фанемы. Гіперфанема і архіфанема. Нейтралізацыя фанемных супрацьпастаўленняў.<br>2. Фаналагічная сістэма беларускай мовы. Паняцце аб фаналагічнай падсістэме запазычаных і рэдкаўжывальных слоў. Сістэма зычных фанем у беларускай мове. Сістэма галосных фанем у беларускай мове.<br>3. Моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Фанемныя рады. Сінтагматычныя адносіны ў фанетыцы і фаналогіі. | | | | | | | |
| **3.** | **Арфаэпія. Графіка** | | **2** | | | | | |
| 3.1. | 1. Прадмет і задачы арфаэпіі. Практычнае значэнне арфаэпіі.<br>2. Асноўныя нормы сучаснага беларускага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах.<br>3. Праблемы варыянтнасці на фанетычным узроўні. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Прычыны, характар і літаратурныя межы арфаэпічнай варыянтнасці ў беларускай мове.<br>4. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Адхіленні ад нормаў літаратурнага вымаўлення і іх прычыны.<br>5. Прадмет і задачы графікі. Графічная сістэма, сучаснай беларускай мовы. Літарныя графічныя сродкі. Алфавіт як аснова графікі. Нялітарныя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), націск, пунктуацыйныя знакі і інш. Гісторыя станаўлення беларускай графікі.<br>6. Суадносіны паміж літарамі (графемамі) і гукамі (фанемамі) у беларускай графіцы. | | 2 | | | Электронны падручнік, курс лекцый | | Пісьмовая работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Складовы і гукавы прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары. | | | | | | | |
| **4.** | **Арфаграфія** | **2** | | | | | **2** | |
| 4.1. | 1. Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Арфаграма і апорнае напісанне. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны, фанематычны (марфалагічны), традыцыйнае і дыферэнцыйнае напісанні.<br>2. Правілы правапісу галосных, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Фанематычныя і традыцыйныя напісанні галосных.<br>3. Правілы правапісу зычных, заснаваныя на фанематычным прынцыпе. Правапіс зычных паводле фанетычнага прынцыпу.<br>4. Прынцыпы і правілы напісання слоў злітна, асобна, праз злучок. Ужыванне вялікай літары.<br>5. Напісанне абрэвіятур і ўмоўных скарачэнняў. Правілы пераносу. | 2 | | | | Электронны падручнік, курс лекцый | 2 | Тэст |
| **5.** | **Лексікалогія** | **6** | **2** | | | | | |
| 5.1. | Слова як асноўная адзінка мовы.<br>1. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы лексікалогіі. Сувязь лексікалогіі з іншымі навукамі.<br>2. Прыметы і функцыі слова. Семантычная структура слова. Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Тыпы лексічных значэнняў.<br>3. Полісемія і манасемія. Семантычная структура мнагазначнага слова. Тыпы полісеміі.<br>4. Варыянтнасць у лексіцы. Тыпы варыянтаў слоў. | 2 | | | | ВМК, курс лекцый | | Вуснае апытванне |
| 5.2. | Сістэмныя адносіны ў лексіцы.<br>1. Гіпера-гіпанімія.<br>2. Аманімія.<br>3. Сінанімія.<br>4. Антанімія.<br>5. Канверсія | 2 | 2 | | | ВМК, курс лекцый | | Тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 6. Паранімія. | | | | | | | |
| 5.3. | Частотная, функцыянальная, этымалагічная і стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы.<br>1. Лексіка беларускай мовы паводле ступені ўжывання.<br>2. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання.<br>3. Безэквівалентная і фонавая лексіка<br>4. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання.<br>5. Лексіка беларускай мовы паводле стылістычнай дыферэнцыяцыі.<br>6. Лексічны аналіз слова. | 2 | | | | ВМК, курс лекцый | | Вуснае апытванне |
| **6** | **Лексікаграфія** | | **2** | | | | | |
| 6.1. | Лексікаграфія як раздзел моваразнаўства<br>1. Задачы лексікаграфіі.<br>2. Тыпалогія слоўнікаў.<br>3. Нормы літаратурнай мовы і слоўнікі.<br>4. Беларуска-славянскія двухмоўныя слоўнікі. | | 2 | | | курс лекцый | | Вусныя выступленні |
| **7** | **Фразеалогія** | **2** | | | | | | |
| 7.1 | Фразеалагізм як адзінка мовы.<br>1. Фразеалогія як лінгвістычная дысцыпліна.<br>2. Паняцце фразеалагічнага зварота.<br>3. Этымалагічная і стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў.<br>4. Семантычная класіфікацыя фразеалагізмаў.<br>5. Марфалагічная класіфікацыя фразеалагізмаў.<br>6. Сінтаксічная класіфікацыя фразеалагізмаў.<br>7. Сістэмныя адносіны ў фразеалогіі.<br>8. Лексічныя замены. Парэміялогія. Афарыстыка. | 2 | | | | ВМК, курс лекцый | | Вуснае апытванне |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Асноўная літаратура


1. Беларуская мова: Хрэстаматыя. Аўт.-склад.: Бадзевіч З.І. і інш. – Мн.: Изд-во Юнипресс, 2005. – 592 с.
2. Беларуская граматыка: У 2 ч.– Мінск: Навука і тэхніка. – Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск, 1985. – 431 с.
3. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1994.
4. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. / навук. рэд. А.А. Лукашанец. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – 351 с.
5. Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. – Мінск, 1998.
6. Савіцкая І.І. Беларуская лексікаграфія: гісторыя і сучаснасць // Вучэбна-метадычны комплекс па спецыяльным курсе для студэнтаў спецыяльнасці 1-210501 Беларуская філалогія. – Мінск: БДУ, 2011. – 38 с.
7. Савіцкая І.І. Сучасная беларуская мова. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія: дапаможнік. – Мінск: БДУ, 2014. – 94 с.
8. Сучасная беларуская мова. Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія / Я.М. Камароўскі [і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1995. – 334 с.
9. Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы. – Мінск, 1996. – 654 с.
10. Чахоўская Т.Л. Чахоўскі Г.К. Сучасная беларуская мова. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Тэарэтычны курс: дапаможнік. – Мінск: БДУ, 2013. – 172 с.


## Дадатковая літаратура


11. Аксамітаў А.С. Беларуская фразеалогія. – Мінск, 1978.
12. Анічэнка У.В. Мовы ўсходніх славян. – Мінск, 1989.
13. Камароўскі Л.М., Сямешка Л.І. Сучасная беларуская мова: Фанетыка, фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. – Мн.,1985.
14. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Практыкум па фанетыцы беларускай мовы. – Мінск, 2003.
15. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. А.Я. Баханькова. – Мінск, 1994.
16. Малажай Г. М. Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм: Вучэбны дапаможнік . – Мінск: Вышэйшая школа, 1992. – 238 с.
17. Плотнікаў Б.А. Беларускае слоўніцтва. – Мінск, 2003.
18. Плотнікаў Б.А. Беларуская мова ў сістэме славянскіх моў. – Мінск, 1999.
19. Сямешка Л.І. Беларуская мова: Вучэбны дапаможнік. – Мінск: Сучаснае слова, 1999. – 224 с.

20. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.
21. Шкраба, І. Лексікалогія: тэарэтычна-практычны курс / Ірына Шкраба – Мінск: Тэхналогія, 2012. – 179 с.
22. Шчэрбін, В.К. Асноўныя складнікі беларускай лексікаграфіі / В.К. Шчэрбін. – Роднае слова. – № 2. – 2009. – С. 38-45.
23. Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія. – Мінск: Народная асвета, 1981. – 79 с.

## СЛОЎНІКІ І ДАВЕДНІКІ

1. Бірыла М.В. Слоўнік націску ў беларускай мове. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 144 с.
2. Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: актуальная лексіка. – Мінск: Попурри, 2005. – 336 с.
3. Грабчыкаў С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы. – Мінск, 1994.
4. Клышка М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. – Мінск, 1993.
5. Лазоўскі У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання. – Мінск, 1994.
6. Лепешаў, І.Я. Слоўнік беларускіх прыказак: Даведнік / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Мінск: БелЭН, 1996. – 352 с.
7. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1. – 672 с.; Т. 2 – 704 с.
8. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭН, 2004. – 448 с.
9. Межъязыковые омонимы и паронимы: Опыт русско-белорусского словаря. – Минск, 1980.
10. Слоўнік беларускай мовы / Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. Імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А.А. Лукашанец, В.П. Русак. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 916 с.
11. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / Аўт.-склад. М.К.Клышка. — Мінск: ПУП “Радыёла-плюс”, 2005. – 672 с.
12. Старычонак В.Д. Слоўнік амонімаў беларускай мовы. – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – 255 с.
13. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. – Мінск: Вышэйшая школа, 1990. – 222 с.
14. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1999. – 784 с.
15. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. Т. 1, 1977. – 608 с.; Т. 2, 1978. – 768 с.; Т. 3, 1979. – 672 с.; Т. 4, 1980. – 767 с.; Т. 5, кн. 1, 1983. – 663 с.; Т. 5, кн. 2, 1984. – 608 с.
16. Уласевіч В.І., Даўгулевіч Н.М. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў. – Мінск: Аверсэв, 2013. – 256 с.
17. Уласевіч В.І., Даўгулевіч Н.М. Слоўнік новых слоў беларускай мовы. – Мінск: ТетраСистемс, 2009. – 448 с.
18. Шкраба І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 320 с.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Сучасная беларуская мова” выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытванне падчас заняткаў;
- пісьмовыя кантрольныя работы;
- камп’ютарныя тэсты;
- пісьмовыя работы (дыктанты, пераклады, сачыненні, эсэ, рэфераванне навуковай літаратуры);
- адзнака па практычных занятках;
- выніковае тэсціраванне.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. Гістарычная граматыка | Гісторыі беларускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 12 ад 19.05.2015 г. |
| 2. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | Гісторыі беларускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 12 ад 19.05.2015 г. |
| 3. Сучасная руская мова | Рускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 10 ад 24.06. 2015 г. |

## ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры (пратакол № ____ ад ________ 201_ г.)

Загадчык кафедры
___к.ф.н. дацэнт___________ ______________ __З.І. Бадзевіч_________
___________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
__д.ф.н. прафесар__________ _______________ __І.С. Роўда__________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча